УО МГПУ им. И. П. Шамякина
Факультет иностранных языков

**І. М. Мацвеенка**

# ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫ АСПЕКТ ВЫВУЧЭННЯ НЕАЛАГІЗМАЎ

Творчасць многіх сучасных паэтаў вызначаецца імкненнем да выкарыстання выразных магчымасцей слова. Гэта знаходзіць сваё ўвасабленне ва ўтварэнні індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў (ІАН) – экспрэсіўных, вытворных, ненарматыўных адзінак маўлення, якія валодаюць прыметамі функцыянальнай аднаразовасці, намінатыўнай факультатыўнасці, сінхронна-дыяхроннай дыфузнасці і індывідуальнай прыналежнасці (ІАН). Паколькі ўсе аказіянальныя словы з'яўляюцца



МГПУ им. И.П.Шамякина

вытворнымі, мы лічым апраўданым ужыванне побач з гэтымі тэрмінамі і тэрмінаў «новаўтварэнне», «наватвор».

Даследаванні ІАН у апошні час сталі больш інтэнсіўнымі. Гэта выклікана зацікаўленасцю лінгвістаў абагачэннем лексічнай сістэмы мовы новымі словамі, што сведчыць аб дынамічным характары мовы і павелічэнні экспрэсіўнай напружанасці маўлення. Пры гэтым увага моваведаў нярэдка скіроўваецца на праблему слова ў мастацкім маўленні, у прыватнасці ў паэтычным маўленні, якое дае матэрыял для вывучэння аўтарскай словатворчасці і функцый аказіянальнага слова ў тэксце.

Распрацоўка праблемы новаўтварэнняў у паэзіі з'яўляецца актуальнай, паколькі мова мастацкіх твораў абапіраецца на літаратурную мову ва ўсёй разнастайнасці яе рэсурсаў. Пры выкарыстанні гэтых рэсурсаў паэт творча падыходзіць да словаўтваральных законаў мовы, камбінуе дэрывацыйныя сродкі, утвараючы новыя словы. Такім чынам, ІАН як факт маўлення з'яўляецца адначасова параджэннем сістэмы мовы.

Вывучэнне аўтарскай словатворчасці дапамагае выяўленню актыўнасці моўных мадэлей, дэманструе законы словаўтварэння і тэндэнцыі развіцця дэрывацыйнай сістэмы мовы.

Пры вывучэнні мовы і яе асаблівасцей існуе тры падыходы: параўнальна-гістарычны, сістэмна-структурны, антрапацэнтрычны. У неалогіі лінгвісты традыцыйна выкарыстоўваюць сістэмна-структурны падыход, апісваюць і класіфікуюць новыя факты мовы і маўлення. Адзінкай сістэмы мовы і маўлення выступае новае слова, а ўсё, што звязана з носьбітам мовы як яе творцам, – ігнаруецца. Як падкрэслівае С. Тагоева, – прадстаўнік псіхалінгвістычнага напрамку даследавання неалагізмаў, – мова вывучана «ўздоўж і ўпоперак», а той, хто ёю карыстаецца, для каго яна і існуе, застаўся без увагі [1, 34].

У сучасным мовазнаўстве назіраецца тэндэнцыя да павароту ў бок чалавека – носьбіта мовы і прадстаўніка соцыуму. Сучасныя напрамкі лінгвістычных даследаванняў характарызуюцца ўзрастаннем увагі да феномена моўнай асобы. Інакш кажучы,

МГПУ им. И.П.Шамякина

мову сталі вывучаць з пункту гледжання яе ўдзелу ў пазнавальнай дзейнасці чалавека.

Антрапацэнтрычны падыход пераключае ўвагу даследчыка з аб'ектаў пазнання (новых слоў) на суб'ект (чалавека, які выкарыстоўвае або стварае новыя словы). І гэта правільна, таму што вывучэнне неалагізмаў не можа быць поўным без даследавання іх прызначэння. З'яўленне новых слоў дыктуецца прагматычнымі патрабаваннямі: чалавек як удзельнік камунікатыўнага акту выбірае з лексічнага матэрыялу тое, што найлепш перадае думкі і пачуцці. Калі такога слова няма, чалавек змяняе ўжо вядомае слова або ўтварае новае. Наваўтварэнне дапамагае ажыццявіць пэўныя камунікатыўныя эстэтычныя і экспрэсіўныя намеры: назваць новую рэалію, дакладна перадаць думку, скараціць словазлучэнне, стварыць пэўны вобраз, прыцягнуць увагу, падкрэсліць адносіны да прадмета гаворкі і інш.

Вывучэннем лексікі з гэтага пункту погляду займаецца функцыянальная лексікалогія. Яна вывучае прагматычны аспект лексікі, г. зн. выяўляе ўнутраныя заканамернасці выбару і ўжывання слова ў канкрэтным камунікатыўным акце, вызначае сувязі паміж працэсам утварэння новых слоў і іх камунікатыўна-прагматычнай накіраванасцю.

Як ужо адзначалася, новыя словы традыцыйна даследуюцца ў сістэмна-структурнай парадыгме, якая ў цэнтр увагі ставіць слова. З пункту погляду ўзаемаадносін з чалавекам даследаванню неалагізмаў удзяляецца недастаткова ўвагі. Аднак вывучэнне новай лексікі патрабуе звароту да двух аспектаў аналізу – да аспекту ўтварэння новай лексікі і да аспекту яе функцыянавання, паколькі функцыянальны аспект даследавання неалагізмаў стане істотным дапаўненнем да аналітычнага спосабу апісання словаўтварэння. Як адзначае А. Кірдун, «высвятленне пытання, як сістэма функцыянуе, будзе садзейнічаць лепшаму разуменню таго, як гэта сістэма арганізавана і з чаго яна складаецца» [2, 102].

Часцей даследчыкі звяртаюцца да вылучэння прычын словатворчасці, не размяжоўваючы паняцці «функцыя» і «прычына». Найбольш поўна прычыны ўтварэння ІАН апісаны ў працах

А. Габінскай [3] і А. Бабенка [4]. Да асноўных яны адносяць: неабходнасць дакладна перадаць думку; імкненне коратка выказаць думку; патрэбу падкрэсліць свае адносіны да прадмета гаворкі, даць яму сваю характарыстыку, ацэнку; імкненне своеасаблівасцю гукавой абалонкі слова звярнуць увагу на яго семантыку; патрэбу пазбегнуць таўталогіі; неабходнасць зберагчы рытм верша, забяспечыць рыфму, патрэбную інструментоўку.

«У цяперашні час можна гаварыць больш аб перспектывах, чым аб выніках распрацоўкі словаўтварэння з функцыянальнага пункту погляду, – адзначае І. Улуханаў [5, 8], – хоць многія адзінкі словаўтваральнай сістэмы ўжо разглядаліся ў функцыянальным аспекце». Магчыма, гэта звязана з тым, што паняцце «функцыя» можна разглядаць у розных аспектах [6, 20]. У вызначэнні паняцця «функцыя» мы прытрымліваемся тлумачэння А. Бандарка: «функцыя моўнай адзінкі – гэта яе здольнасць да выканання пэўнага прызначэння, патэнцыял функцыянавання і разам з тым рэалізацыя гэтай здольнасці, г. зн. вынік, мэта функцыянавання» [7, 8]. Паняцце «функцыя» прадугледжвае ўзаемадзеянне часткі і цэлага, элемента і сістэмы, таму можна сказаць, што функцыя – гэта прызначанасць элемента (новага слова) да служэння сістэме (маўленню). Функцыянаванне – рэалізацыя гэтай прызначанасці ў працэсе маўлення.

У працы «Русская разговорная речь. Общие вопросы. Словообразование. Синтаксис» вылучаны чатыры функцыі словаўтварэння: намінатыўная (якая, дарэчы, многімі дэрыватолагамі прызнаецца асноўнай функцыяй вытворнага слова), экспрэсіўная, канструктыўная, кампрэсіўная [8, 85–88]. Пазней А. Земская палічыла мэтазгодным вылучыць стылістычную функцыю [9, 8–12] і функцыю гульні [10, 186].

У тэорыі мовазнаўства, як адзначае А. Кірдун [2, 103], выдзяляецца звыш 25 функцый мовы і яе адзінак, таму вышэйпералічаныя класіфікацыі функцый словаўтварэння не з'яўляюцца канчатковымі. Пытанне аб характары і колькасці функцый словаўтварэння і яго адзінак з'яўляецца яшчэ адной нявырашанай праблемай неалогіі. Праблема функцыянальнага аспекту даследавання ІАН з'яўляецца асабліва актуальнай для беларускага мовазнаўства,

МГПУ им. И.П.Шамякина

паколькі да цяперашняга часу ў ім адсутнічаюць спецыяльныя даследаванні функцый аўтарскіх новаўтварэнняў. Да гэтага часу прызначэнне новаўтвораных слоў асвятлялася ў працах Л. Сом [11], Т. Міхалкінай [12]. Адсутнасць больш-менш поўнага апісання функцый словаўтварэння стварае цяжкасці для пераходу даследаванняў на новы ўзровень, прапанаваны А. Кубраковай, – аналіз функцый у супастаўляльным, кагнітыўным, генетычным планах [13, 141].

У сувязі з вышэйсказаным у нашым даследаванні робіцца спроба апісання ІАН, выяўленых у творах сучаснай беларускай паэзіі, з функцыянальнага пункту погляду. Намі распрацавана наступная класіфікацыя функцый ІАН (гл. дыяграму):




МГПУ им. И.П.Шамякина

У аснове класіфікацыі ляжаць такія прыметы ІАН як сувязь з кантэкстам і экспрэсіўнасць. Неалагізмы, якія выконваюць функцыі, названыя намі агульнымі, маюць слабую сувязь з кантэкстам, для іх семантызацыі дастаткова нулявога кантэксту. Гэта нейкім чынам аб'ядноўвае іх з узуальнымі новаўтварэннямі, функцыі якіх (намінатыўная, канструктыўная, кампрэсіўная, экспрэсіўная,

стылістычная) апісваюцца А. Земскай [9, 199]. Паколькі мы разглядаем функцыянаванне ІАН у паэтычных творах, то лічым неабходным размежаваць гэтыя функцыі з мастацкімі, уласцівымі паэтычнаму маўленню. Акрамя таго, экспрэсіўнасць ІАН, якія выконваюць агульныя функцыі, выражана слаба, у той час як у наватвораў, якія рэалізуюць мастацкія функцыі, яна праяўляецца ў большай ступені. Гэта паслужыла прычынай аднясення экспрэсіўнай (у вузкім сэнсе слова) функцыі ў склад мастацкіх. Адзначым два важныя моманты, якія мы ўлічваем пры функцыянальным аналізе ІАН:

1) усе ІАН валодаюць экспрэсіўнасцю і адрозніваюцца толькі ступеннню яе праяўлення [14, 31];

2) многія ІАН выконваюць не адну функцыю ў мастацкім тэксце, г. зн. яны з'яўляюцца поліфункцыянальнымі адзінкамі [9, 204].

Пры функцыянальным аналізе ІАН мы сутыкнуліся з вялікай колькасцю прыкладаў, дзе аказіяналізмы выконваюць адразу некалькі функцый, якія перасякаюцца. Пры перасячэнні бывае так, што адна функцыя з'яўляецца цэнтральнай, а астатнія – другаснымі. Узяць, напрыклад, традыцыйнае размежаванне неолагамі намінатыўнай і экспрэсіўнай функцый. Адзін і той жа ІАН можа выконваць і намінатыўную, і экспрэсіўную функцыі. Напрыклад, у беларускай мове словам *філолаг* называюць і мужчын, і жанчын. Паэт М. Мятліцкі ўтварае новае слова ***філалагіня*** (жанчына-філолаг), якое выконвае намінатыўную функцыю: *Мае багіні вы –* ***філалагіні****! / Я ў сэрцы вочы кожнай прыбярог. / Хачу, каб вечар гэты мройна-сіні / Іх ад тугі пахмурай засцярог.* Калі замяніць слова ***філалагіні*** на *жанчыны-філолагі*, сэнс тэксту не зменіцца, але згубіцца экспрэсія. Таму, акрамя намінатыўнай, гэта новаўтварэнне нясе эмацыянальна-ацэначную нагрузку, выявіць якую дапамагае кантэкст. Побач з новаўтварэннем аўтар ужывае узуальнае слова *багіні*, якое выступае ў якасці структурнага актуалізатара (тэрмін Р. Намітокавай) ІАН. Аўтар параўноўвае сваіх аднагрупніц з багінямі і на ўзор гэтага слова ўтварае ІАН ***філалагіні***. Такім чынам, слова ***філалагіні***

МГПУ им. И.П.Шамякина

выконвае па меншай меры дзве функцыі. Альбо, напрыклад, новаўтварэнне ***ясоніць***: *Паплывём мы з ім, паплывём, / Не адны паламаўшы вёслы, / Не дзівіцца бліскучым руном, / А спаткаць залатыя вёсны, / Праз якія цячэ рака, / Дзе плюскочуць віры і тоні, / Пазіраючы на дзівака, / Што і сёння яшчэ* ***ясоніць*** (У. Марук). Гэта слова выконвае некалькі функцый: называе новую рэалію – дзеянне (намінатыўная функцыя), замяняе словазлучэнне *паводзіць сябе, як Ясон* адным словам ***ясоніць*** (кампрэсіўная функцыя), актуалізуе інтэртэкстуальныя сувязі, прымушае звярнуцца да міфалогіі – патрэбна ведаць, хто такі Ясон, каб зразумець сэнс ІАН (інтэртэкстуальная функцыя).

Функцыі неалагізмаў нельга вызначыць па-за кантэкстам. Для вывучэння новага слова ў функцыянальным аспекце неабходна звяртацца да кантэксту, які дапамагае ўстанавіць значэнне неалагізма, фіксуе выкарыстанне неалагізма ў канкрэтнай функцыі, замацоўвае яго значэнне і ўжыванне. Напрыклад, каб зразумець сэнс ІАН ***чырваназвыклы***, патрэбна звярнуцца да мінікантэксту (кантэксту страфы): *Напрыканцы сямідзесятых, / Калі яшчэ мы ў талент верылі, / Як верыць толькі ў Бога, / А ў пашпартах* ***чырваназвыклых*** */ Прывабных візаў не было...* (У. Сцяпан). Словы *пашпарт* і *віза* выступаюць як тэкставыя актуалізатары. Вертыкальны кантэкст (веды носьбітаў мовы) дапаможа зразумець сэнс часткі *чырвана-*: пашпарт грамадзяніна СССР меў чырвоную вокладку. Значыць, ***чырваназвыклы*** – гэта агульнаграмадзянскі пашпарт чырвонага колеру часоў СССР, які, аднак, не даваў права выезду за межы краіны. ***Чырваназвыклы*** – ІАН, ужыты для характарыстыкі эпохі 80-х гг., калі на захад маглі выехаць толькі людзі з «незвычайнымі» пашпартамі.

Такім чынам, функцыянальны падыход у даследаванні неалагізмаў становіцца адным з прыярытэтных напрамкаў сучаснай лінгвістыкі. Ён дае магчымасць выявіць, як і чаму чалавек выкарыстоўвае новыя словы, у тым ліку індывідуальна-аўтарскія, у розных сітуацыях, якія функцыі выконваюць гэтыя словы ў тэксце. Даволі часта ІАН выконвае некалькі функцый,

МГПУ им. И.П.Шамякина

што выклікае пэўныя цяжкасці пры яго даследаванні ў функцыянальным аспекце.

Літаратура

1. Тогоева, С. И. Психолингвистические проблемы неологии / С. И. Тогоева. – Тверь : Твер. гос. ун-т, 2000. – 155 с.

2. Кірдун, А. А. Функцыі вытворных адзінак тэмпаральнай лексікі / А. А. Кірдун // Функцыянальныя аспекты словаўтварэння : даклады IX Міжнар. навук. канф. Камісіі па славянскаму словаўтварэнню пры Міжнар. камітэце славістаў, Мінск, 9–14 кастр. 2006 г. / Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі ; навук. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск, 2006. – С. 102–108.

3. Габинская, О. А. Причины современного русского словотворчества : автореф. дис. ... д-ра филол. наук : 10.02.01 / О. А. Габинская ; Ленинград. гос. пед. ин-т им. А. И. Герцена. – Л., 1985. – 32 с.

4. Бабенко, Н. Г. Окказиональное в художественном тексте. Структурно-семантический анализ : учеб. пособие / Н. Г. Бабенко. – Калининград : Изд-во Калининград. гос. ун-та, 1997. – 81 с.

5. Улуханов, И. С. Состояние и перспективы изучения функционального словообразования / И. С. Улуханов // Функцыянальныя аспекты словаўтварэння: даклады IX Міжнароднай навуковай канферэнцыі Камісіі па славянскаму словаўтварэнню пры Міжнародным камітэце славістаў, Мінск, 9–14 кастр. 2006 г. / Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі ; навук. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск, 2006. – С. 7–21.

6. Киклевич, А. К. Лекции по функциональной лингвистике / А. К. Киклевич. – Минск : Изд-во БГУ, 1999. – 215 с.

7. Теория функциональной грамматики / А. В. Бондарко [и др.] ; под общ. ред. А. В. Бондарко. – 2-е изд., стер. – М. : Эдиториал УРСС, 2001. – 347 с.

8. Земская, Е. А. Русская разговорная речь. Общие вопросы. Словобразование. Синтаксис / Е. А. Земская, М. В. Китайгородская, Е. Н. Ширяев. – М. : Наука, 1981. – 276 с.

9. Земская, Е. А. Словообразование как деятельность / Е. А. Земская. – М. : Наука, 1992. – 221 с.

10. Земская, Е. А. Игровое словообразование // Е. А. Земская / Язык в движении: к 70-летию Л. П. Крысина ; отв. ред. Е. А. Земская. – М. : Языки славянской культуры, 2007. – С. 186–194.

11. Сом, Л. *«Цьмяніць ліхтар...»* Індывідуальна-аўтарскія наватворы ў тэкстах сяброў таварыства вольных літаратараў / Л. Сом // Роднае слова. – 2001. – № 4. – С. 53–55.

МГПУ им. И.П.Шамякина

12. Михалкина, Т. А. Внелитературная лексика в языке произведений А. Солженицына : дис. … канд. филол. наук : 10.02.02 / Т. А. Михалкина ; Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины. – Минск, 2000. – 152 с.

13. Кубрякова, Е. С. О новых задачах в изучении функций словообразования / Е. С. Кубрякова // Функцыянальныя аспекты словаўтварэння: даклады IX Міжнароднай навуковай канферэнцыі Камісіі па славянскаму словаўтварэнню пры Міжнародным камітэце славістаў, Мінск, 9–14 кастр. 2006 г. / Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі ; навук. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск, 2006. – С. 141–148.

14. Намитокова, Р. Ю. Авторские новообразования: структура и функционирование (на материале современной поэзии) : автореф. дис. ... д-ра филол. наук : 10.02.01 / Р. Ю. Намитокова ; Адыгейский гос. пед. ин-т. – Майкоп, 1989. – 33 с.

МГПУ им. И. П. Шамякина